Т.Я.Камароўская.

ЛАНГФЕЛА (Longfellow) Генры Уодсуарт (27.2.1807, г. Портленд, штат Мэн, ЗША — 24.3.1882), амерыканскі паэт і празаік. Замежны чл. Пецярбургскай АН (з 1872). Скончыў Боудайнскі каледж (1825), вышэйшую адукацыю атрымаў у Еўропе (1826—29). У 1836—54 праф. літаратуры Гарвардскага ун-та. Друкаваўся з 1820. Аўтар рамант. паэт. зб-каў «Галасы ночы» (1839), «Вершы пра рабства» (1842), «Пералётныя птушкі» (1858), паэм «Эванджэліна» (1847), «Сватанне Майлза Стэндыша» (1858), раманаў «Гіперыён» (1839), «Кавана» (1849), кн. нарысаў «За акіянам» (1835) 1 інш. Сусв. вядомасць прынесла паэма «Спеў аб Гаяваце» (1855), напісаная на аснове індзейскіх паданняў на ўзор карэла-фін. эпасу «Калевала». Паэма апявае прыгажосць і мудрасць чалавека, які жыве адным жыццём з прыродай. Пераклаў «Боскую камедыю» Дантэ, склаў і пераклаў зб. «Паэты і паэзія Еўропы» (1846), анталогію «Вершы пра мясцовасці» (т. 1—31, 1876—79). На бел. мову «Спеў аб Гаяваце» пераклаў А. Куляшоў, асобныя творы Ю.Гаўрук, А.Мардвілка.

Тв.: Бел. пер. — у кн.: Лангфэла Г. Спеў аб Гаяваце: Паэма; Уітмен У. Лісце травы: Вершы. Мн., 1994. Рус. пер. — Избранное М., 1958.

Літ.: Небышынец В. «Вам, хто любіць слухаць казкі, галасы легенд далёкіх...» // Полымя. 1970. № 12; Ронгонен Л.И. Генри У. Лонгфелло и его поэма «Песнь о Гайавате». М., 1982.

Т.Я.Камароўская.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ